# ПРАГРАМА КАНФЕРЭНЦЫІ

**Месца правядзення**: УА «Сярэдняя школа № 2 г. Гарадка імя А.П. Сабалеўскага» (*вул. Невельская шаша, 16*)

**Пачатак:** 12.00

**Рэгламент для дакладаў:** 15 мін.

---

## *12.00–12.30 — АДКРЫЦЦЁ КАНФЕРЭНЦЫІ*

## *ПРЫВІТАННІ Ў АДРАС УДЗЕЛЬНІКАЎ І ГАСЦЕЙ КАНФЕРЭНЦЫІ:*

---

- ***КАВАЛЕНЯ Аляксандр Аляксандравіч***, Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, акадэмік НАН Беларусі.
- ***БУЗОЎСКІ Ігар Іванавіч***, намеснік Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь. “*Інфармацыйны механізм як фактар фарміравання гістарычнага народа з этнічнай супольнасці*”
- ***ДУРНОЎ Вячаслаў Віктаравіч,*** намеснік старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.
- ***ПАЛЯКОВА Ірына Міхайлаўна***, старшыня Гарадоцкага раённага выканаўчага камітэта.
- ***КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч***, старшыня грамадскай творчай арганізацыі “Саюз пісьменнікаў Беларусі”.
- ***БАБІЧАЎ Уладзімір Генадзьевіч***, першы сакратар Віцебскай абласной арганізацыі ГА “БРСМ”.
- ***ЗЕЛЯНКО Вольга Уладзіміраўна***, намеснік дырэктара па навукова-метадычнай рабоце Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
- ***КАРПОВІЧ Ірына Уладзіміраўна***, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

---



***УЗНАГАРОДЖАННЕ*** *пераможцаў конкурсу, прысвечанага Году міру і стварэння.*

***УЗНАГАРОДЖАННЕ*** *прадстаўнікоў Гарадоцкага раёна, якія ўнеслі значны ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна.*

# ДАКЛАДЫ

**12.30–12.45**

**ЛАКОТКА Аляксандр Іванавіч**, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік НАН Беларусі

***“Тэма міру і стваральнай працы ў беларускім мастацтве”***

**12.45–13.00**

**МЫСЛІВЕЦ Мікалай Лявонцьевіч**, дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт

***“Сучасны беларускі чытач: нарыс партрэта”***

**13.00–13.15**

**САВЕРЧАНКА Іван Васільевіч**, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар

***“Асэнсаванне беларускай гісторыі ў мастацкай літаратуры”***

**13.15-13.30**

**МЕЗЕНКА Ганна Міхайлаўна**, доктар філалагічных навук, прафесар

***“Сучасны гарадоцкі ўрбананімны тэкст у люстэрку сацыяхранатопу”***

**13.30–13.45**

**КАПЫЛОЎ Ігар Лявонавіч**, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

***“Нацыянальны культурны код у сістэме ўласных імёнаў Гарадоцкага раёна”***

**13.45–14.00**

**ЗАХАРАВА Ксенія Віктараўна**, вучаніца 5 “Б” класа ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Гарадка імя І.Х. Баграмяна”

***“Мой дом – дом знаменитого земляка Дзержинского Л.И. Взгляд сквозь время”***

**14.00–14.15**

**ВАЛОДЗІНА Таццяна Васільеўна**, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Інстытута мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар

"***Фальклорная спадчына Гарадоччыны: адметнае і ўніверсальнае***"

**14.15–14.30**

**КУРЦОВА Вераніка Мікалаеўна**, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

"***Беларуска-расійскае моўнае памежжа (гарадоцка-невельскі рэгіён): агульнае і рознае ў сучасным дыялектным маўленні***"

**14.30–14.45**

**БАГДАНОВІЧ Ірына Эрнстаўна**, дактарант Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

"***Пясняр Дзвіны і Палоты: беларускія матывы і вобразы ў паэзіі ўраджэнца Гарадка, паэта, святара і педагога Юзафа Маралёўскага (1777–1845)***"

**14.45–15.00**

**ЛІТВІН Аляксей Міхайлавіч**, загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар

"***Гарадоччына ў гады Вялікай Айчыннай вайны: праблемы вывучэння***"

---

## 15.00–15.20 – ПЕРАПЫНАК

---

**15.20–15.35**

**РАМІШЭЎСКІ Канстанцін Ігаравіч**, старшы навуковы супрацоўнік рэспубліканскай лабараторыі гісторыка-культурнай спадчыны Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

"***Минай Шмырев в объективе фронтового оператора Бориса Макасеева***"

---

**15.35–15.50**

**ЛАГУНОЎ Ігар Мікалаевіч**, краязнавец

***"Белорусский язык в духовной жизни жителей Городокщины"***

**15.50–16.05**

**ЯКАВЕНКА Наталля Васільеўна**, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела славістыкі і тэорыі мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, дацэнт

**"«*…Я ўсё бачу і адчуваю*»: *Янка Маўр – дзіцячы пісьменнік і рэдактар*"**

**16.05–16.20**

**ЗАПРУДСКІ Ігар Мікалаевіч**, дактарант філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**"*Новае пра Канстанціна Вераніцына*"**

**16.20–16.35**

**ПІКУЛІК Алена Мікалаеўна**, старшы навуковы супрацоўнік аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Інстытута мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**"«*Тарас на Парнасе*» *в искусстве белорусской книги XX–XXI веков*"**

**16.35–16.50**

**ДОЎНАР Аляксандр Барысавіч**, загадчык аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII стагоддзяў і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**"*Інвентар Азярышчанскага староства 1738 г.*"**

**16.50–17.00**

**БАРАНОЎСКІ Аляксандр Віктаравіч**, загадчык аддзела навукова-інфармацыйнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук

**"*Ліквідацыя Гарадоцкага павета Віцебскай губерні ў 1923 г.*"**

# ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КАНФЕРЭНЦЫІ

# АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ДЗЕЙНАСЦІ

## ІНСТЫТУТА МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА






***БЕЛАРУСКАЯ МОВА*** *– дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь, нацыянальная мова беларускага народа – з’яўляецца неад’емным атрыбутам незалежнасці краіны, найважнейшым сродкам камунікацыі ў асноўных сферах зносін, фактарам кансалідацыі і яднання беларускай нацыі, галоўным элементам беларускай культуры, сімвалам нацыянальнай свядомасці і ідэнтыфікацыі, сродкам захавання і перадачы сацыяльнага вопыту. Паўнавартаснае і ўсебаковае развіццё нацыянальнай мовы з’яўляецца гарантам гуманітарнай бяспекі краіны, садзейнічае павышэнню міжнароднага прэстыжу дзяржавы.*



**ІНСТЫТУТ МОВАЗНАЎСТВА ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА** –



адна з найстарэйшых навукова-даследчых устаноў нашай краіны. Ён быў створаны 2 лістапада 1929 года рашэннем Прэзідыума Беларускай акадэміі навук на базе мовазнаўчых кафедраў і камісій, што існавалі ў структуры Інстытута беларускай культуры. З самага пачатку існавання дзейнасць Інстытута была накіравана на правядзенне сістэмных даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства, забеспячэнне патрэб моўнай практыкі і навучальнага працэсу, фарміраванне і падтрымку нацыянальна-культурных прыярытэтаў беларускага народа.

У Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа былі падрыхтаваны буйныя фундаментальныя працы па беларускай мове, якія не толькі забяспечылі міжнародны аўтарытэт беларускай філалагічнай навукі, але і засведчылі статус беларускай мовы як самастойнай высакаразвітай літаратурнай мовы, якая можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя і культурныя патрэбы сучаснага беларускага грамадства, сталі тэарэтычнай і фактычнай базай для вучэбнай літаратуры па беларускай мове для ўсіх узроўняў адукацыі.

Ад часу заснавання Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа ажыццяўляюцца сістэмныя даследаванні па гісторыі беларускага пісьменства. Найбуйнейшымі працамі ў гэтым напрамку з'яўляюцца "*Гісторыя беларускай мовы*" ў 2 тт. (акадэмік А.І.Жураўскі, І.І.Крамко, А.К.Юрэвіч, А.І.Яновіч, 1967–1968 гг.), "*Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы*" (член-карэспандэнт НАН Беларусі А.М.Булыка, 1970), "*Гістарычная лексікалогія беларускай мовы*" (А.М.Булыка, А.І.Жураўскі, І.І.Крамко, З.К.Турцэвіч, А.І.Яновіч і інш., 1970), "*Мова беларускай пісьменнасці XIV–XVIII стст.*" (А.М.Булыка, А.І.Жураўскі, І.І.Крамко, У.М.Свяжынскі, 1988), "*Мова выданняў Францыска Скарыны*" (А.М.Булыка, А.І.Жураўскі, У.М.Свяжынскі, 1990), "*Рэлігійны слоўнік старабеларускай мовы*" (І.У.Будзько, 2003), "*Слуцкае Евангелле: беларускі рукапіс XVI ст.*" (Н.В. Паляшчук, Г.У.Федарэнка, Э.В.Ярмоленка, 2008), "*Падручны гістарычны слоўнік субстантыўнай лексікі*" ў 2 тт. (2012), "*Кароткі гістарычны слоўнік беларускай мовы*" (2015), "*Лексіка старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы XIV – сярэдзіны XVI ст.*" (2016) і інш.



Адна з найважнейшых падзей – выданне 37-томнага "*Гістарычнага слоўніка беларускай мовы*", першага і адзінага ў айчыннай гуманітарнай навуцы даведніка, які з максімальнай паўнатой адлюстроўвае багацце слоўнікавага фонду беларускай мовы XIV–XVIII стст., з'яўляецца надзейнай крыніцай пазнання мінулага Беларусі, дае змястоўную інфармацыю аб сацыяльна-эканамічным жыцці, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. У выпусках слоўніка дэталёвую лексікаграфічную апрацоўку атрымалі больш за 40 000 слоў, зафіксаваных у граматах, дагаворах, статутах, летапісах, хроніках, храніграфах, воінскіх і рыцарскіх раманах і аповесцях, мемуарных, публіцыстычных, навуковых і рэлігійных творах.

У Інстытуце ажыццяўляецца таксама комплекснае даследаванне сучаснага стану беларускай мовы, асноўных працэсаў і тэндэнцый эвалюцыі яе слоўнікавага складу і граматычнага ладу, сувязей з іншымі славянскімі і неславянскімі мовамі, а таксама падрыхтоўка фактычнай базы для патрэб сучаснай моўнай практыкі і вучэбнага працэсу на ўсіх узроўнях адукацыі. Вынікам гэтага з'явіліся наступныя працы: "*Граматычны слоўнік дзеяслова*" (2007, 2013); "*Граматычны слоўнік назоўніка*" (2008, 2013); "*Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя*" (2009, 2013); "*Русско-белорусский словарь*" в 3-х томах (2012, 10-е издание); "*Беларуска-рускі слоўнік*" у 3-х тамах (2012, 4-е выданне); манаграфія "*Дынаміка літаратурнай нормы сучаснай беларускай мовы*" (2015); новы аднатомны "*Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы*" (2016); дыялектны слоўнік "*Полацкія дыяменты*" (2016); "*Лінгвістычны мікраатлас Тураўшчыны*" (2016); "*Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы*" (2017); матэрыялы Ярушэвіча А.В. "*Расейска-беларускі слоўнік. Архіўная спадчына*" (І.У.Галуза, 2018); зборнік "*Прастора мовы. Моўныя сувязі. Гісторыя слоў: выбраныя працы*" (Г.А. Цыхун, 2018); зборнік навуковых артыкулаў "*Беларуская мова ў сакральнай сферы: гісторыя і сучаснасць*"

(2019); тэматычны слоўнік “*Плытніцтва*” (2019); “*Французска-беларускі слоўнік прававой лексікі*” (2019); “*Русско-белорусский толковый словарь по металлургии и литейному производству*” (2020); “*Кітайска-беларускі слоўнік. Беларуска-кітайскі слоўнік*” (2021); двухтомны “*Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы*” (2022); двухтомны “*Русско-белорусский системный семантический словарь*” (2023); зборнік дыялектных тэкстаў “*Вайна – трагедыя і памяць народа. Расказваюць сведкі падзей*” (2023) і інш. На сённяшні дзень у Інстытуце завяршаецца выданне шматтомнага “*Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы*”, рыхтуецца да выдання новы фундаментальны “*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*” ў 15 тамах.

У Інстытуце мовазнаўства ўпершыню створаны сінтэзатар беларускага маўлення (тэставая версія), які можа выкарыстоўвацца ў інфармацыйна-даведачных і інтэрактыўных сістэмах. Пачаў дзейнічаць даведачны-інфармацыйны партал «Моўная даведка», на якім друкуюцца адказы на пытанні чытачоў і праводзяцца анлайн-кансультацыі.

У 2015 г. на базе Інстытута мовазнаўства створаны кластар “*Міжнародная школа беларускай мовы і літаратуры*”. У рамках дзейнасці кластара праводзяцца адкрытыя лекцыі, навукова-практычныя семінары, круглыя сталы па актуальных праблемах беларускага мовазнаўства, арганізуюцца сустрэчы з прадстаўнікамі розных краін замежжа, якія не толькі валодаюць беларускай мовай, але і прафесійна займаюцца пытаннямі беларусістыкі.

Інтытут мовазнаўства супрацоўнічае з навуковымі і навучальнымі ўстановамі краін замежжа, праводзяцца сумесныя з вучонымі Расіі навуковыя даследаванні па вывучэнні гаворак памежных тэрыторый.

У Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа вядуцца даследаванні па найбуйнейшым у гісторыі сусветнай лінгвагеаграфіі шматгадовым міжнародным праекце “*Агульнаславянскі лінгвістычны атлас”* (АЛА), над якім працуюць мовазнаўцы 12 славянскіх краін і Германіі.

13 лютага 2020 г. у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа адбылося адкрыццё “*Школы юнага лінгвіста*”. Школа з’яўляецца дадатковай формай адукацыі вучнёўскай моладзі, якая садзейнічае больш глыбокаму і ўсвядомленаму пранікненню ў сутнасць моўных з’яў пры дапамозе аналітычнай работы над тэкстамі розных стыляў і жанраў.

На базе Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа пастаянна працуюць *Рэспубліканская тапанімічная камісія пры НАН Беларусі* і *Рэспубліканская тэрміналагічная камісія пры НАН Беларусі*. Членамі камісій праводзяцца кансультацыі, даюцца каментары па пытаннях, звязаных з тапанімікай і тэрміналогіяй, рыхтуюцца заключэнні на запыт дзяржаўных устаноў краіны, судовых і выканаўчых органаў, зваротаў арганізацый і грамадзян.

У рамках супрацоўніцтва з *Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь* супрацоўнікамі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа ажыццяўляецца пераклад заканадаўчай базы на беларускую мову (перакладзены “Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь”, “Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь”, “Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі”, “Жыллёвы кодэкс Рэспублікі Беларусь”, “Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб нетрах”, “Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь”, “Лясны кодэкс Рэспублікі Беларусь”, “Кодэкс гандлёвага мараплаўства Рэспублікі Беларусь”, “Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях” і інш.).

Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа таксама аказвае паслугі па лінгвістычнай экспертызе тэкстаў, устанаўленні ідэнтычнасці запісаў у дакументах, па перакладзе інфармацыі на беларускую мову на сайтах, інш.

# ВЫДАННІ
# ІНСТЫТУТА МОВАЗНАЎСТВА
# ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА




**220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1/2**
**тэл./факс: (+375 17) 270 18 85**
**http://iml.belcentre.by**

# ДЛЯ НАТАТАК